**Канспект прагулкі**
**“Героі маёй вёскі”**

**Мэта:** пазнаёміць дзяцей з помнікам землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (на тэрыторыі аграгарадка Зенькавічы).

Перад прагулкай выхавальнік прапануе дзецям успомніць правілы дарожнага руху.

**Выхавальнік:** Выходзячы з дому, вы трапляеце ў дзіўны свет, у якім столькі новага і цікавага! Кожны павінен ведаць, як трэба сябе паводзіць у двары, на вуліцы, дзе ездзіць шмат транспарту. Удзельнікі дарожнага руху павінны паважаць адзін аднаго, быць ветлівымі і ўважлівымі. Але ж без ведаў правілаў дарожнага руху, гэта немагчыма. Давайце з вамі ўспомнім для чаго патрэбна дарога?

(Адказы дзяцей)

**Выхавальнік:** 1. Рухацца за дарослым па правым баку абочыны;
2. Пры пераходзе праезджай часткі паглядзець спачатку налева, потым – направа, падняць сігнальныя сцяжкі;
3. Дарогу пераходзіць хутка і арганізавана;
4. Гаварыць у паўголаса, не размахваць рукамі;
5. Каля помніка захоўваць цішыню.

**Выхавальнік:** Дзеці, мы з вамі жывём у аграгарадку Зенькавічы. У яго цэнтры размешчаны помнік воінам-аднавяскоўцам, якія баранілі нашу вёску ад ворагаў у гады вайны.

Шмат гадоў таму на нашу краіну прыйшла бяда: вялізнае фашысцкае войска ўварвалася на тэрыторыю нашай Радзімы без аб’яўлення вайны. Гэта быў летні дзень 22 чэрвеня 1941 года. Свяціла сонейка, саграваючы зямлю сваімі промнямі, спявалі птушкі… Нішто не прадвяшчала бяды. І раптам, данеслася страшная вестка аб тым, што пачалася вайна. Людзі, усе як адзін, усталі на абарону Радзімы. Ваявалі не толькі салдаты, але і простыя людзі, якія ніколі не трымалі ў руках зброі. Так і на абарону нашай вёскі ўсталі нашы аднавяскоўцы. А куды мы з вамі прыйшлі?

**Дзеці:** Да помніка.

**Выхавальнік:** Давайце падыйдзем бліжэй і разгледзім яго. А што такое помнікі? Навошта яны?

(Адказы дзяцей)

**Выхавальнік:** Слова “помнік” паходзіць ад слоў “памяць”, “памятаць”. Гэта скульптурныя збудаванні, абеліскі. Будуюць іх у гонар якога-небудзь героя вайны ці важнай падзеі. Помнік напамінае сапраўдным і будучым пакаленням аб тых, хто загінуў у партызанскіх атрадах, на палях бітваў, хто проста не дажыў да Дня Перамогі.

**Выхавальнік:** У нашай вёсцы Зенькавічы, ёсць яшчэ помнік загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны. Вы ведаеце дзе ён знаходзіцца?

(Адказы дзяцей)

Абавязкова спытайце ў бацькоў пра яго месцазнаходжанне, а магчыма, і пабывайце там. На наступным тыдні раскажаце нам пра гэты помнік.

**Выхавальнік:** Паглядзіце, на помніку шмат надпісаў. Як вы думаеце, што гэта за надпісы?

(Адказы дзяцей)

**Выхавальнік:** Так, тут напісаны імёны і прозвішчы аднавяскоўцаў, якія пайшлі на вайну і не вярнуліся.

Дзеці чытаюць раней падрыхтаваныя вершы:

**Вечный огонь**

1 дзіця: Над могилой, в тихом парке
Расцвели тюльпаны ярко.
Вечно тут огонь горит,
Тут солдат совецкий спит.

2 дзіця: Мы склонились низко – низко
У подножья обелиска,
Наш венок расцвёл на нём
Жарким, пламенным огнём.

3 дзіця: Мир солдаты защищали,
Жизнь за нас они отдали.
Сохраним в сердцах своих
Память светлую о них!

4 дзіця: Как продолжение жизни солдат
Под звёздами мирной державы
Цветы на могилах горят
Венками немеркнущей славы.

**Выхавальнік:** Людзей, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны успамінаюць хвілінай маўчання, прыносяць да помнікаў вянкі, кветкі. Давайце і мы ўскладзём кветкі да помніка.

Дзеці ўскладаюць раней падрыхтаваныя кветкі да помніка.

Гучыць гімн Рэспублікі Беларусь.

**Выхавальнік:** А что такое, хвіліна маўчання? Хвіліна маўчання – сімвалічны рытуал, падчас якога трэба ўстаць і моўчкі пастаяць. Гэта памяць загінуўшым людзям.

Праводзіцца “хвіліна маўчання”.

**Выхавальнік:** У многіх з вас прабабулі і прадзядулі таксама ваявалі, подзвігі гэтых герояў мы будзем памятаць заўсёды.

**Праводзіцца фізкультхвілінка:**

На одной ноге постой – ка,
Будто ты солдатик стойкий,
Ногу правую к груди
Да смотри не упади
А теперь постой на левой
Если ты солдатик смелый
Раз – два дружно в ногу
Три – четыре шире шаг.

**Выхавальнік:** Народ памятае аб тых, хто загінуў абараняючы сваю краіну: складае песні, вершы, узводзіць помнікі, захоўвае матэрыялы аб абаронцах Айчыны ў музеях. Ёсць людзі, якія прайшлі ўсю вайну, вярнуліся дадому з фронта. Як мы іх называем?

(Адказы дзяцей)

**Выхавальнік:** Правільна, гэта нашы ветэраны. Мы іх ніколі не забудзем. 9 мая мы святкуем Дзень Перамогі. Калі вы ўбачыце чалавека з ордэнамі, павіншуйце яго са святам і скажыце яму “дзякуй” за тое, што абараняў нашу Радзіму ад ворагаў і падарыў нам мірнае неба і шчаслівае дзяцінства.

*Пасля дзецям прапаноўваецца*
*намаляваць на асфальце “Мірнае жыццё”.*